# ГУРТУ "ПАЛАЦ" - 20



"Палац" - беларускі музычны гурт з Менска, заснаваны ў кастрычніку 1992 года. У лістападзе 2000 года гурт браў удзел у першым беларускім свяце фольку "Таўкачыкі" ў Менску. Гісторыя "Палаца" пачалася ў 1987 годзе, калі пазнаёміліся Алег Хаменка ды Юры Выдронак. Яны вучыліся ў Менскім інстытуце культуры (зараз - Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). У 1988 годзе да гурту далучыўся сябар Юрыя Зміцер Карабач. Яшчэ праз год да гурту далучыўся Юрась Белякоў. Назву "Палац" прапанаваў Алег Хаменка ў 1992-м годзе. У рэпертуар увайшлі беларускія песні, апрацаваныя ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі папулярнай музыкі ды актыўным выкарыстаннем сэмплаў.

З гэтай нагоды музыкі выпускаюць новы альбом і ладзяць канцэрт.

Альбом атрымаў назву "Кола грукатала", паведамляе "Еўрарадыё". Па словах лідара "Палаца" Алега Хаменкі, дыск будзе прадстаўляць сабой складанку лепшых і новых песень гурта, напісаных цягам апошніх шасці гадоў.

Алег Хаменка: *"Няма канцэпцыі ў альбома. Гэта нашы песні, якія не выдаваліся ў нумарных альбомах, якія былі запісаныя цягам апошніх шасці гадоў. Сярод іх тое, што ўваходзіла ў розныя складанкі, і некалькі песень, якія яшчэ нідзе не гучалі. Акрамя вельмі вядомых і даўно створаных песень, такіх, як "Кола грукатала" ці "Праваджала маці сына", будзе "Шэрая поўсць", якую ніхто не чуў, "Стаіць вярба", якую мы толькі некалькі разоў гралі на канцэртах. То бок, альбом будзе свайго роду кампіляцыяй хітоў за апошнія шэсць гадоў"*.

Алег Хаменка кажа, што будучая пласцінка "Палаца" яму вельмі падабаецца. Перад Калядамі яна з'явіцца ў інтэрнэце ў вольным доступе. А набыць яе, спадзяецца музыка, можна будзе ўжо на канцэрце-святкаванні юбілею, які пройдзе 26 кастрычніка ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.

*"На канцэрце будуць сябры, з якімі мы працавалі апошнія гады,* - распавядае Алег пра святочны спектакль у тэатры. - *Будуць музыканты, якія працавалі разам з "Палацам", і ад якіх мы ўзбагаціліся ў творчасці і ў жыцці, і якія засталіся нашымі сябрамі. Будуць калегі. Думаю, што нейкія моманты віншавання мы зрэжысуем. Але, можа, гэтага і не трэба! Хочацца нечага лёгкага, такога, як у святочны дзень. Каб гэта была не справаздача, а каб гэта было свята"*.

Падчас канцэрту прагучаць толькі тыя песні "Палаца", якія любяць граць музыкі гурта. Па гэтай прычыне, жартуе Алег, і праграма юбілею мае назву "Сяброўскі канцэрт гурта "Палац" з лепшымі песнямі любові і мудрасці".

*Паводле "Еўрарадыё".*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ